**Грыгаровіч Я.Д.,**
прафесар

# НАКІРАВАНАСЦЬ АСОБЫ ЯК АБ'ЕКТ НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Значным дасягненнем сучасных псіхалагічнай і педагагічнай навук можна лічыць перанос увагі даследчыкаў з міфічнага калектыўнага, групавога, грамадскага выхавання маладога пакалення на рэальнае індывідуалізаванае ўздзеянне на чалавечую асобу, адпаведнае яе ўзроставым асаблівасцям, псіхалагічным характарыстыкам, умовам жыцця і сацыяльнага вопыту.

Асобасны падыход дазваляе выбраць той змест, тыя метады і сродкі ўздзеяння, якія аптымальныя для канкрэтнага студэнта, эфектыўныя (для пэўных абставін і акалічнасцей яго вучэбнай і творчай дзейнасці), якія вядуць да найбольш пазітыўных вынікаў.

Аднак "асобасная педагогіка", як можна яе назваць, надзвычай складаная ў прыкладных аспектах, патрабуе дасканалага ведання тэорыі асобы, яе структуры, асноўных уласцівасцей і якасцей студэнта, асаблівасцей яго жыццядзейнасці і сацыяльнага вопыту. Толькі пры валоданні гэтымі характарыстыкамі педагог-даследчык зможа вырашыць сваю асноўную педагагічную задачу – знайсці адэкватныя псіхалагічнай структуры асобы спосабы ўздзеяння на яе.

Для гэтага неабходна вызначэнне важнейшай сістэмаўтваральнай інтэгруючай характарыстыкі чалавека, уздзеянне на якую гарантавала б станоўчыя зрухі ва ўсёй псіхічнай структуры чалавека. Менавіта накіраванасць, якая вызначае матывы, мэты, імкненні, патрэбы чалавека, і накіроўвае яго дзейнасць на рэалізацыю ўнутраных запатрабаванняў і жыццёвых задач, з'яўляецца гэтай сістэмаўтваральнай псіхалагічнай характарыстыкай.

Катэгорыя накіраванасці вывучаецца еўрапейскімі вучонымі ўжо шмат гадоў, аднак адназначнай фармулёўкі

Рэпазіторый БГУКІ

паняцця, нэўнай трактоўкі яго прыроды пакуль не існуе. Нераспрацаванасць псіхалагічнай катэгорыі патрабуе набудовы тэарэтычнай мадэлі гэтага складанага псіхічнага феномена з вызначэннем трывалай структуры, асноўных кампанентаў у іх узаемасувязі і ўзаемадзеянні, вызначэння яго аб'ёму, відаў, тыпалогіі, крытэрыяў сфарміраванасці, шляхоў і сродкаў развіцця накіраванасці як сістэмаутваральнай якасці асобы.

У невялікім артыкуле, безумоўна, немагчыма даць распрацоўку тэарэтычнай мадэлі і ўмоў яе развіцця, таму абмяжуемся галоўным — паспрабуем разабрацца ў сутнасці гэтага феномена, выявіць яго асноўныя часткі і даць фармулёўку паняцця, абапіраючыся на асноўныя псіхолага-педагагічныя даследаванні. Гэта патрабуе шмат руплівай працы, вялікай даследчай дзейнасці, але яна неабходна для разумення існасці асобы, пошуку аптымальных шляхоў уздзеяння на яе.

Аналітычны агляд сучаснай замежнай і айчыннай псіхолага-педагагічнай літаратуры паказвае, што псіхалагічная катэгорыя накіраванасці распрацоўваецца еўрапейскімі вучонымі ўжо звыш паўстагоддзя і мае багатую і разнастайную гісторыю. Паняцце "накіраванасць" уведзена ў навуковы ўжытак знакамітым вучоным С.Л.Рубінштэйнам пры распрацоўцы тэорыі дзейнасці і дзейнаснага падыходу ў філасофіі, псіхалогіі і педагогіцы. Актыўнае развіццё гэтае паняцце атрымала ў 60–80-я гады XX стагоддзя ў шматлікіх працах прадстаўнікоў савецкай псіхалагічнай навукі.

Накіраванасць разглядаецца большасцю псіхолагаў як "дамінуючая тэндэнцыя" (С.Л.Рубінштэйн), "дамінуючыя адносіны" (У.М.Мясішчаў), "асноўная жыццёвая накіраванасць" (Б.Г.Ананьеў), як вядучая характарыстыка асобы, адзін з істотных кампанентаў псіхалагічнай структуры (К.К.Платонаў), які, рэпрэзентуючы асноўны змест матывацыйна-патрэбнаснай сферы асобы, уплывае на ўсе бакі жыццядзейнасці чалавека. Гэтае распаўсюджанае ў расійскай псіхалогіі ўяўленне аб накіраванасці асобы як



Рэпазіторый БГУКИ

іерархічнай сістэме матываў упершыню сфармулявана Л.І.Бажовіч: у аснове накіраванасці, на яе погляд, ляжыць “трывала дамінуючая сістэма матываў, якая ўзнікае ў працэсе жыцця і выхавання чалавека, дзе асноўныя, вядучыя матывы, падпарадкоўваючы сабе ўсе астатнія, характарызуюць будову матывацыйнай сферы чалавека” (1, с. 422).

Значная частка сучасных даследчыкаў прытрымліваюцца вышэйапісанага пункту гледжання без істотных змен (А.В.Засімоўскі, Т.Е.Коннікава, Н.К.Каціленкаў, В.Е.Чудноўскі і інш.), другія пашыраюць азначэнне паняццем “матывацыйныя комплексы” або “групы матываў” (А.М.Мееровіч, Я.Е.Нікірэеў, Н.Ю.Ткачова і інш.) або супастаўляюць накіраванасць і матывацыйную сферу, разглядаючы накіраванасць як матывацыйныя фактары (Б.І.Дадонаў, М.І.Дзьячэнка, Л.А.Кандыбовіч, В.А.Круцецкі, Б.Ф.Ломаў, К.К.Платонаў, В.А.Сласцёнін і інш.).

У шэрагу псіхалагічных даследаванняў асаблівая ўвага звяртаецца на неабходнасць уліку ў характарыстыцы накіраванасці не толькі дамінуючых матываў, але і ўсёй іх сістэмы і ўзаемных суадносін як асобных матываў, так і іх груп, іншымі словамі, матывацыйных комплексаў. Гэтая пазіцыя даволі пераканаўчая, таму што ў ёй выяўляецца сістэмны падыход не толькі да структуры асобы ў цэлым, але і да яе накіраванасці, паколькі змены ў структуры размяшчэння аднаго з яе кампанентаў вядуць да змены ўсёй сістэмы і адпаведна да змены накіраванасці асобы.

Б.Г.Ананьеў пісаў аб накіраванасці як аб “вялікай жыццёвай мэце”, С.А.Зімічава і Г.П.Колеў — як аб сістэме не матываў, а мэт асобы, не ўключаючы першыя ў азначэнне накіраванасці. Мэты без матываў (аднак разам з іншымі кампанентамі) уключаюць у накіраванасць таксама і іншыя даследчыкі (Г.А.Тамілава, П.М.Якабсан). На першы погляд, іх пункт гледжання цалкам супадае з тлумачэннем слова “накіраванасць” як імкнення да якой-небудзь мэты, сканцэнтраванасці на якіх-небудзь

Репозиторий БГУКИ

прадмеце ці з'яве. Аднак тут назіраецца некаторая супярэчнасць, таму што, па-першае, пры аналізе прафесійнай накіраванасці, напрыклад, разглядаюцца матывы выбару прафесіі, што не мае непасрэднага дачынення да вывучаемай з'явы, а па-другое, многімі аўтарамі справядліва канстатуецца шчыльная ўзаемасувязь матываў і мэт (у тым ліку і ў складзе накіраванасці асобы). Так, С.Л.Рубінштэйн пісаў: "Праблема накіраванасці — гэта, у першую чаргу, пытанне аб дынамічных тэндэнцыях, што ў якасці матываў вызначаюць дзейнасць чалавека, самі ў сваю чаргу суадносяцца з яе мэтамі і задачамі". І далей: "Матыў дзеянняў чалавека натуральна звязаны з іх мэтамі, паколькі матывам з'яўляецца пабуджэнне ці імкненне яе дасягнуць" (2, с. 564; гл. таксама іншыя працы С.Л.Рубінштэйна).

Цікавай у плане суадносін матываў і мэт у накіраванасці асобы з'яўляецца канцэпцыя А.М.Лявонцьева. Ён вылучае матывы-стымулы, якія, "стымулюючы дзейнасць, разам з тым надаюць ёй асобасны сэнс"; матывы, звязаныя з адносінамі суб'екта да свету, грамадства, людзей, сябе; матывы галоўныя, сэнсаўтваральныя, ад якіх залежыць асобасны сэнс мэты, а для суб'екта ўсведамленне і дасягненне мэты "ёсць спосаб сцвярджэння яго жыцця", "задавальнення і развіцця яго патрэбнасцей, апрадмечаных у матывах дзейнасці. Калі маюць на ўвазе галоўны матыў, які стымулюе чалавека, то звычайна кажуць аб жыццёвай мэце"; адносіны матыву да мэты выражаюць паняцце сэнсу; "станаўленне цэласнай сістэмы асобасных сэнсаў — станаўленне асобы" (3, с. 181, 212, 213, 218, 223).

Паводле А.М.Лявонцьева, "важнейшы параметр асобы ёсць ступень іерархізаванасці дзеянняў, іх матываў" (3, с. 222), падпарадкаванасць іх галоўнаму "матыву-мэце" (3, с. 223). Калі ж лічыцца з меркаваннем большасці даследчыкаў аб тым, што важнейшай падструктурай, цэнтрам, ядром асобы з'яўляюцца менавіта яе накіраванасць і менавіта матывы і мэты ў іх спалучэнні ці



Рэпазіторый БДУКІ

паасобку, то атрымліваецца, што яны з'яўляюцца асноўнымі кампанентамі накіраванасці.

На падставе выказанага правамерным уяўляецца вызначэнне накіраванасці як іерархічнай сістэмы сэнсаўтваральных матываў у іх адносінах да асноўных жыццёвых мэт асобы, як іх трактуюць вядомыя вучоныя Н.І.Рэйнгальд, В.М.Паляруж. Іншыя кампаненты ўваходзяць у накіраванасць і адпаведна характарызуюць яе ў той ступені, у якой яны выступаюць матывамі (інтарэсы, схільнасці, патрэбнасці і інш.) або мэтамі (ідэалы) дзейнасці асобы.

Патрабуе асобага разгляду і роля накіраванасці ў дзейнасці чалавека, суадносін пэўных уласцівасцей асобы ў матывацыйнай сферы, вызначэння іх значнасці ў спосабах рэалізацыі дзейнасці, якія пакуль што не атрымалі дастатковага асвятлення ў псіхалагічных і педагагічных працах, у тым ліку ў грунтоўных і значных, спецыяльна прысвечаных даследаванню розных аспектаў асобы.

У аснову падыходу да разумення дынамічнага боку накіраванасці асобы большасцю псіхолагаў пакладзены погляд С.Л.Рубінштэйна, які лічыў, што "тэндэнцыі, як звязаныя са станам напружання дынамічныя сілы, якія ўтвараюцца ў працэсе дзейнасці і падахвочваюць да яе, заключаюцца ў патрэбнасцях, інтарэсах, ідэалах" (4, с. 625). Разам з тым абгрунтаванае вылучэнне стымулюючай функцыі накіраванасці выклікала неабгрунтаванае яе атаясамліванне з некаторымі пабуджэннямі дзейнасці асобы.

Так, А.С.Прангішвілі, характарызуючы паняцце "ўстаноўкі" як "непраходзячую працяглую гатоўнасць" актывацыі пэўна матываванай дзейнасці", разглядае асобу як сукупнасць і цэласнасць вызначаных установак, прапануе трактаваць установку як модус цэласнага суб'екта (асобы), на базе якога ўзнікае дзейнасць з акрэсленай накіраванасцю (5, с. 21, 24). Аднак распаўсюджваць уплыў устаноўкі на ўсю дзейнасць асобы некарэктна, таму што неабходнай умовай з'яўлення

Репозиторий БГУКИ

ўстаноўкі, акрамя патрэбнасці, выступае і наяўнасць адпаведнай ёй сітуацыі. Але ж сітуацыі, якія адпавядаюць задавальненню патрэбнасцей асобы ў дзейнасці, не захоўваюцца ў нязменным выглядзе, таму што, уцягваючы ў сваю дзейнасць усё новыя і новыя акалічнасці, чалавек тым самым стварае новыя сувязі.

Такім чынам, устаноўка не забяспечвае надсітуацыйнай актыўнасці асобы і таму не можа атаясамлівацца з яе накіраванасцю. Як справядліва адзначаюць паслядоўнікі атаясамлівання накіраванасці асобы з яе матывацыяй, найбольш істотным для чалавека як асобы з'яўляецца ўзнікненне ў яго матывацыйнай сферы зусім новых па будове псіхалагічных утварэнняў, якія вызваляюць яго ад непасрэдных сітуацыйных уплываў.

У гэтым плане важнай уяўляецца заўвага В.Г.Асеева аб тым, што матывацыя (а не матыў) уключае ўсе віды пабуджэнняў: матывы, інтарэсы, мэты, устаноўкі, дыспазіцыі, ідэалы і да т. п. (гл. 6, с. 7). Пры гэтым матывы — гэта спецыфічныя псіхічныя рэальнасці, і яны не зводзяцца да іншых псіхалагічных з'яў, якія выконваюць у дзейнасці асобы не менш важныя функцыі. Аднак было б няправільна проціпастаўляць матывы і мэты, таму што без мэт самыя добрыя матывы могуць заставацца добрымі намерамі, і ў той жа час мэты самі па сабе без матываў не вызначаюць ні якасці, ні працягласці, ні паспяховасці дзейнасці. Такім чынам, атаясамліванне накіраванасці асобы з яе матывамі або з яе мэтамі таксама ўяўляецца недастаткова абгрунтаваным.

Разам з тым неабходна падкрэсліць, што ўказаныя пабуджэнні асобы, будучы элементамі яе як сістэмы, адначасова самі выступаюць сістэмнымі ўтварэннямі, што знаходзіць выражэнне ў іх поліфункцыянальнасці. Аднак кожнае асобнае ўтварэнне выконвае ў дзейнасці асобы і такую функцыю, удзельная вага якой сярод іншых функцый значна вышэй і набывае характар дамінуючай. Гэта значыць, матыў выконвае ў дзейнасці функцыю пабуджэння, больш значную і эфектыўную, чым іншыя

Рэпазіторый БДУКІ

функцыі. У той жа час мэта канструюе дзейнасць, вызначаючы яе характар і дынаміку, і, такім чынам, кіруе дзейнасцю, што і з'яўляецца яе дамінуючай функцыяй нараўне з пабуджэннем. Але ж усялякая дзейнасць асобы полiматываваная і полімэтанакіраваная. Таму неабходна прызнаць справядлівым меркаванне С.Л.Рубінштэйна аб тым, што "паміж рознымі пабуджэннямі чалавечай дзейнасці... звычайна ўстанаўліваецца пэўная іерархія" (2, с. 638).

На гэтую акалічнасць указвае і Л.І.Бажовіч, калі падкрэслівае, што ў працэсе развіцця складваецца адносна ўстойлівая іерархія матывацыйнаай сферы чалавека: прычым устойлівасць ёй, а значыць, і паводзінам чалавека надаюць матывы, якія ідуць ад вышэйшых сістэмных новаўтварэнняў (7, с. 113). Указаныя палажэнні дазваляюць пагадзіцца з развіваемым Н.І.Рэйнвальд падыходам, калі накіраванасць асобы разглядаецца як іерархічна пабудаваная сістэма пабуджэнняў асобы (гл. 8, с. 82).

Аднак аналіз падыходаў да разумення дынамічнага боку накіраванасці асобы неабходна працягнуць у плане вылучэння яе функцыі. Гаворка ідзе аб тым, што паміж значымасцю мэты і цягай, імкненнем, воляй заключаецца самая спецыфічная і своеасаблівая рыса накіраванасці чалавека і тэндэнцый, якія яе ўтвараюць. Іншымі словамі, тэндэнцыі цягі ператвараюцца ў тэндэнцыі неабходнасці, яны адрозніваюцца сваімі крыніцамі і зместам, але аналагічныя па дынамічным эфекце. Так адбываецца, калі сацыяльна значныя мэты і задачы, якія ставяцца грамадствам перад індывідам і ім прымаюцца, становяцца асобасна значнымі для яго. Разыходзяцца пункты гледжання вучоных і на ўсвядомленасць матывацыі чалавека.

Некаторыя вучоныя (С.Л.Рубінштэйн, В.Г.Асееў) звяртаюць увагу на тое, што фарміраванне свядомавалявога ўзроўню матывацыі заключаецца, па-першае, ва ўтварэнні іерархічнай, многаўзроўневай сістэмы рэгуляцыі і ў цэнтралізацыі гэтай рэгуляцыі; па-другое, у супраць-

пастаўленні вышэйшага ўзроўню і імпульсіўнай цягі, якая фарміруецца стыхійна.

В.Г.Асееў і іншыя лічаць, што ў чалавека адначасова могуць назірацца дзве накіраванасці — свядомая і несвядомая. Пры гэтым падкрэсліваецца, што ў тых выпадках, калі палярнасць інтарэсаў не ўсведамляецца, перамагае заўсёды той матыў, які адпавядае асноўнай тэндэнцыі асобы, яе накіраванасці. І пры ўсведамленні палярнасці інтарэсаў дзейнічае матыў, які пераважае, калі ён усведамляецца і прымаецца асобай. Калі ж матыў характэрны для асобы, але не прызнаецца ёю, то ў сітуацыі выбару перамагае той, які асоба лічыць больш высокім і каштоўным.

У гэтым плане цікавая заўвага Н.І.Рэйнвальд аб тым, што ігнараванне той акалічнасці, што ўсвядомленае чалавекам у адным плане (напрыклад, разуменне непасрэднай мэты сваёй дзейнасці, прадбачанне яе вынікаў) можа не ўключацца ім у больш шырокае кола адносін, застаючыся ў гэтым сэнсе неўсвядомленым, часта выклікае непрадуктыўныя спрэчкі (8, с. 137). І сапраўды, неадэкватнае разуменне палярнасці інтарэсаў, уяўляючы сабой тыповую несвядомасць, зусім не выключае ўсведамлення чалавекам сваіх бліжэйшых мэт. У гэтым апошнім сэнсе мэтанакіраваная дзейнасць чалавека заўсёды свядомая. Нельга быць Чалавекам у поўным сэнсе гэтага слова, калі не адносіцца свядома да сябе, свайго акружэння, сваёй справы, не імкнучыся суаднесці, зразумець ва ўзаемасувязі свае і "чужыя" праблемы. Таму ступень свядомасці з'яўляецца важнейшым паказчыкам узроўню развіцця асобы.

Праведзены аналіз асноўных падыходаў да разумення дынамічнага боку накіраванасці асобы як усвядомленай абарачальнасці тэндэнцый цягі ў тэндэнцыі неабходнасці, іерархія якіх вызначае ўступленне ў дзеянне таго ці іншага пабуджэння, пераконвае ў наступным. Агульнапрынятае разуменне накіраванасці як сістэмаўтваральнай уласцівасці асобы, што вызначае яе псіхалагічны склад, раскрываецца

Рэпазіторый БДПУ

з дынамічнага боку ў пэўнай іерархічнай будове сістэмы пабуджэнняў асобы, якія выконваюць функцыі арыентацыі, кантролю, ацэнкі або кіравання ў яе дзейнасці.

У замежнай псіхалогіі накіраванасць асобы як прадмет спецыяльных даследаванняў намі не зафіксаваная, але ў шэрагу прац па праблеме матывацыі паводзін (Ч.Агрыс, Дж.Гілфард, Х.Левінсон, Р.Лікерт, А.Маслоў, К.Роджэрс і інш.), у даследаваннях альтруізму (Л.Бікман, Д.Розенхат і інш.) атрымліваюць асвятленне асобныя параметры і формы праяўлення і характарыстыкі дадзенага феномена, умовы яго карэкцыі. У пераважнай большасці ў іх даследаваннях галоўны ўпор робіцца таксама не на зместавым, а на дынамічным (энергетычным) баку матывацыі паводзін.

Падводзячы вынікі, можна ў абагульненай форме сказаць, што тэарэтыка-метадалагічнай асновай трактоўкі накіраванасці асобы з'яўляюцца палажэнні, распрацаваныя ў даследаваннях сістэмнага характару дзейнасці (Б.Ф.Ломаў), адзінства свядомасці і дзейнасці (С.Л.Рубінштэйн, А.М.Лявонцьеў), полімотываванасці дзейнасці (А.М.Лявонцьеў, В.Г.Асееў), псіхалогіі педагагічных зносін (А.А.Лявонцьеў, С.В.Кандрацьеў, А.А.Бадалёў, Г.А.Кавалёў). Зыходзячы з гэтага, можна вызначыць накіраванасць асобы як "псіхічную ўласцівасць, якая выяўляе агульную накіраванасць дзейнасці чалавека ў разнастайных канкрэтных абставінах жыцця" (В.С.Мерлін), што фарміруецца "ў выніку іерархізацыі матывацыйнай структуры асобы і абумоўлівае яе выбіральныя паводзіны ў разнастайных сітуацыях і арыентацыю дзейнасці на дасягненне жыццёва важных мэт (А.М.Меровіч), выступае "як найбольш істотная яе характарыстыка, якая забяспечвае выбіральнасць актыўнасці ў канкрэтных сітуацыях і цесна звязаная з рэалізацыяй жыццёвых мэт" (С.І.Сеідаў); "галоўны элемент структуры асобы, які ўяўляе сабой сукупнасць вядучых матываў, ядро асобаснай структуры", гэта ядро



Репозиторий БГУКИ

ўказвае на ўплыў розных (сацыяльных, біялагічных, псіхалагічных) фактараў на яе фарміраванне (Ф.А.Фрадкін); "ядро асобы" (М.С.Неймарк, Л.І.Бажовіч); "сістэмаўтваральная ўласцівасць асобы" (Б.Ф.Ломаў); стрыжнявое інтэгруючае ўтварэнне асобы (Л.І.Бажовіч, А.В.Засімоўскі, Б.Ф.Ломаў, Г.Л.Смірноў і інш.), вядучая характарыстыка (В.М.Паляруж).

Такім чынам, накіраванасць у канцэнтраваным выглядзе — гэта псіхічная ўласцівасць асобы, вядучая, найбольш істотная характарыстыка, якая вызначае дзейнасць асобы і выяўляецца ў гэтай дзейнасці і паводзінах чалавека. У аснове накіраванасці ляжыць іерархічная сістэма сэнсаўтваральных матываў, у якой дамінуючыя матывы, падпарадкоўваючы астатнія, вызначаюць будову матывацыйнай сферы чалавека.

---


1. Божович Л.И. Личность и ее формирование в детском возрасте. — М.: Просвещение, 1968. — 435 с.

2. Рубинштейн С.Л. Бытие и сознание (о месте психического во всеобщей взаимосвязи явлений). — М.: Изд-во АПН СССР, 1957. — 328 с.

3. Леонтьев А.Н. Деятельность. Сознание. Личность // Леонтьев А.Н. Избранные психологические произведения: В 2 т. — М., 1983. — Т. 2. — С. 94—231.

4. Рубинштейн С.Л. Основы общей психологии. — М.: Учпедгиз, 1946. — 704 с.

5. Прангишвили А.С. Исследования по психологии установки. — Тбилиси: Мецниереба, 1967. — 340 с.

6. Асеев В.Г. Мотивация поведения и формирование личности. — М.: Мысль, 1976. — 157 с.

7. Божович Л.И. О культурно-исторической концепции Л.С.Выготского // Вопросы психологии. — 1988. — № 5. — С. 108—116.

8. Рейнвальд Н.И. Психология личности. — М.: Изд-во Ун-та дружбы народов, 1987. — 196 с.


Репозиторий БГУКИ